І. І. БАМБЕШКА

# ПРАЕКТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ

Ідучы на сустрач новым запытам сучаснага наведвальніка, музеі перабудоўваюць сваю работу з улікам асаблівасцей сацыякультурнай сітуацыі рэгіёна ўсё часцей звяртаюцца да інавацыйнай праектнай дзейнасці. На першы план выходзяць культуратворчыя функцыі музеяў, іх здольнасць не толькі захоўваць, але і выпрацоўваць і актуалізаваць культурную спадчыну рэгіёна, што значыць «уключаць у сучасную культуру шляхам актывізацыі сацыякультурнай ролі яго аб'ектаў і іх інтэрпрэтацыі» [2, с. 312].

Практыка актуалізацыі культурнай спадчыны знаходзіць сваё ўвасабленне ў шматграннай культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі.

Асобай формай укаранення інавацый і арганізацыі музейна-адукацыйнай дзейнасці, а таксама эфектыўнай формай партнёрства з'яўляецца праектная дзейнасць музея, якая як новая тэхналогія ў музейнай справе набывае ў апошнія часы не толькі ўсё большую распаўсюджанасць, але і дэманструе значную эфектыўнасць у параўнанні з традыцыйнымі формамі музейна-педагагічнай дзейнасці. Праекты – гэта, як правіла, яркія музейныя мерапрыемствы, якія выклікаюць вялікі грамадскі рэзананс. Тэрмін іх рэалізацыі даволі непрацяглы, хаця сустракаюцца выключэнні. Кожнаму музею неабходны свой арыгінальны праектны тэзаўрус, які вылучае менавіта гэты музей у музейнай сетцы, які замацоўвае за ім свой новы імідж і прыцягвае аўдыторыю.

Праект – распаўсюджаная з'ява сучаснай музейнай культуры Беларусі. «Праектам» называецца і адкрыццё новага музея, музейнага будынку, стварэнне і адкрыццё новай музейнай экспазіцыі ці правядзенне рээкспазіцыі, а таксама асобныя акцыі, выстаўкі, навуковыя даследаванні і г. д. Значэнне гэтага тэрміна вельмі шырокае і размытае. Аднак ужо сам факт існавання ў жыцці музея «праектнай работы», «праектнага менеджменту» верагодна павінен надаваць музею налёт сучаснасці і інавацыйнасці. Праектная работа адкрывае цэлы шэраг новых маг-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чымасцей для музея. Гэта і дадатковае фінансаванне супрацоўнікаў, і магчымасць рэалізацыі творчых, прафесійных інтарэсаў, і папулярызацыя дзейнасці музея, і прыцягненне новых наведвальнікаў і г. д.

У праектную дзейнасць уцягваюцца не толькі буйныя, цэнтральныя музеі нашай краіны, але і рэгіянальныя краязнаўчыя музеі, колькасць якіх у Беларусі складае больш за палову ад агульнай колькасць дзеючых у сістэме Міністэрства культуры музеяў.

Аналіз вывучанай літаратуры дазваляе класіфікаваць праекты па ўзроставым складзе аўдыторыі, мэтаваму прызначэнню. Так, па ўзросту аўдыторыі праекты могуць быць дзіцячымі, маладзёжнымі і для дарослых, па мэтавым прызначэнні могуць быць сацыяльнымі, адукацыйнымі і вольнага часу. І вось менавіта на сацыяльных праектах мы хацелі б спыніцца больш падрабязней. Сярод іх найбольш цікавымі і значнымі можна назваць праекты Капыльскага раённага краязнаўчага музея, Навагрудскага гістарычна-краязнаўчага музея і некаторых іншых.

Адным з першых быў праект-даследаванне «Уклад у сусветную культуру ўраджэнцаў Капыльшчыны, якія эмігрыравалі ў пачатку ХХ ст.». Праект быў накіраваны на пошук імёнаў землякоў-эмігрантаў, чыё жыццё ці дзейнасць былі звязаны з Беларуссю, у прыватнасці з Капыльшчынай. Праект быў рэалізаваны ў 2010 г. сумесна з прадстаўніцтвам зарэгістраванага аб’яднання «Deutscher Volkshochschul – VerbandeV» (ФРГ) у Рэспубліцы Беларусь у межах конкурсу «Гісторыя ХХ ст. у адукацыі дарослых». Тэма была выбрана не выпадкова, паколькі гісторыя эмігрантаў з Капыльшчыны была мала вывучана і практычна не прадстаўлена ў экспазіцыі музея. У той час многія жыхары Капыльшчыны эмігрыравалі не толькі ў ЗША, але і ў краіны Заходняй Еўропы. Адны з’язджалі туды, але вярталіся назад, іншыя заставаліся за мяжой на пастаяннае жыхарства. Адны знікалі без вестак, іншыя – унеслі вялікі ўклад у развіццё сусветнай культуры. Доўгі час гэтая тэма была закрыта. Падчас працы над праектам выяўлена сем імёнаў землякоў-эмігрантаў (Л. Падгорскі-Аколаў, М. Даманская, І. Мазэ, К. Петрусевіч, М. Духаў, З. Манькоўская (Тшашчкоўская), Я. С. Наркевіч) [1].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такія пошукі дазволілі найбольш поўна прадставіць падарожжы нашых землякоў па розных краінах, ацаніць іх уклад у развіццё культуры і навукі, іх прызнанне еўрапейскімі і сусветнымі супольнасцямі незалежна ад светаўспрымання і палітычных поглядаў. Імёны гэтых людзей звязаны з гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі Капыльшчыны – сядзібна-паркавымі комплексамі, дзе яны пражывалі [9].

Дадзены праект даў магчымасць захаваць артэфакты (друкаваныя выданні, фотаздымкі, дакументы і г. д.) пачатку XX ст. і выкарыстоўваць іх у вывучэнні культурнай спадчыны Капыльскага рэгіёну. З перасоўнай выставай, якая разлічана на дарослую аўдыторыю, музей змог наведаць кожны куток Капыльскага раёна. Вынікам рэалізацыі праекта стала таксама выданне брашуры «Навекі постаць сваю захаваўшыя...».

Акрамя таго, праект паступова перарос у своеасаблівы прэс-тур «Па сядзібах Эдварда Вайніловіча», да якога была выдадзена брашура да 100-годдзя Чырвонага касцёла ў Мінску [9].

Наступная распрацоўка Капыльскага музея «Апекуны шчасця» стала адной з пераможцаў адукацыйнага праекта «TOLLAS – да актыўнага грамадства ў любым узросце», які праводзіла ўжо згаданае дабрачыннае таварыства «Deutscher Volkshochshul-Verband e. V.» (ФРГ) сумесна з міжнароднай грамадскай арганізацыяй «Адукацыя без межаў» [8, с. 1; 5]. Партнёрамі музея ў справе рэалізацыі міні-праекта сталі мясцовыя дзяржаўныя і грамадскія аб’яднанні, навучальныя ўстановы.

Для рэалізацыі міні-праекта «Апекуны шчасця» была падрыхтавана неабходная база: на працягу пяці гадоў у музеі праходзіла адукацыйнае мерапрыемства «Роля прадметаў побыту і этнаграфіі ў правядзенні беларускага нацыянальнага вяселля» з адпаведнай экспазіцыяй [4]. Акрамя таго, у музеі на працягу некалькіх гадоў праводзіўся вясельны абрад «Апекуны шчасця» для маладых, якія завітвалі сюды пасля роспісу ў ЗАГСе. Садзейнічала папулярызацыі праекта і выстаўка «Лялькі-чараўніцы» (карысталіся вялікай папулярнасцю ў нашых продкаў, пераважна ў жанчын), якая таксама прыцягнула шмат увагі капыльчан. Усе гэтыя абставіны стымулявалі з’яўленне ў супрацоўнікаў музея інтарэсу да такіх вырабаў, яны пачалі вывучаць іх, а з часам зацікавіліся вясельнай лялькай-куваткай. Бы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ла арганізавана група з сталых людзей, якія спачатку вывучалі згубленыя элементы побытавай славянскай культуры пры правядзенні вясельных абрадаў, а потым прыступілі да вырабу лялек-куватак і сувенірных вясельных куфэркаў. Падчас ужо ўпадабаных капылянам вясельных абрадаў (праводзяцца ў музеі кожны тыдзень) пажылыя людзі і выкарыстоўвалі атрыманыя веды.

Маладыя, што бяруцца шлюбам, цалкам праходзяць вясельны абрад сваіх продкаў. Яны пакідаюць музей з мноствам падарункаў: велізарным пшанічным караваем на індывідуальны заказ, кнігай «Памяць» Капыльскага раёна, каб яны і іх дзеці залатымі літарамі ўпісалі ў агульную гісторыю сваёй зямлі асабістыя здабыткі. Новаспечаныя сужэнцы атрымліваюць ляльку-куватку, ці ляльку-неразлучніцу, якая звязвае жонку і мужа ў адно цэлае. Акрамя таго, ім дораць куфэрак – прататып таго куфра, дзе захоўвалі пасаг нашы бабулі. Усе госці вяселля атрымліваюць вялікую імянную грамату, зробленую супрацоўнікамі музея, па якой іх дзеці могуць наведваць музей бясплатна. Гэты праект меў на мэце пераемнасць пакаленняў: малодшага (дзяцей, унукаў), сярэдняга (бацькоў) і старэйшага (бабуль і дзядуль). Дзякуючы праекту ў 2012 г. з’явілася кніга «Апекуны шчасця», фільм «Калядныя сямейна-бытавыя абрады» [4]. Статыстыка сведчыць аб тым, што названы праект і адпаведнае мерапрыемства аказаліся вельмі запатрабаванымі ў жыхароў Капыля і Капыльшчыны: толькі за 2013 г. 69 маладых пар разам са сваімі гасцямі ўдзельнічалі ў вясельным абрадзе, а за 4 гады прайшло каля 250 мерапрыемстваў, якія пастаянна дапаўняюцца новымі элементамі [9].

У Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі працягваецца праект «Крытычны разгляд гісторыі праз дыялог пакаленняў. Раскажы мне сваё жыццё», які таксама можна лічыць сацыяльным. Праект ажыццяўляецца пры падтрымцы германскага Фонду EVZ «Памяць, адказнасць, будучыня» праз міжнароднае грамадскае аб’яднанне «Узаемаразуменне». Мэтавай групай з’яўляюцца былыя остарбайтары – людзі, якіх прымусова вывозілі на працы падчас акупацыі 1941–44 гг., а таксама сталыя людзі, якія былі сведкамі Другой сусветнай вайны [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэты праект з’яўляецца інавацыйным ў плане супрацоўніцтва музея з навучальнымі ўстановамі, дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі горада, а таксама непасрэдна людзьмі, у прыватнасці з пенсіянерамі. У межах праекта арганізоўваюцца нефармальныя сустрэчы «У гасцях у...» (галоўным героем кожнай сустрэчы з’яўляецца пажылы чалавек, які дзеліцца сваім жыццёвым вопытам, хобі і г. д.), сустрэчы з ахвярамі нацызму і ўдзельнікамі падзей ваенных гадоў, запіс і дакументаванне жыццёвых успамінаў і інтэрв’ю; дзейнічае сацыяльны тэатр з удзелам пажылых людзей; наладжваюцца сумесныя экскурсіі маладых і пажылых людзей. У рамках праекта пры музеі дзейнічаюць гурткі: журналісцкі «Вучымся журналістыцы» і фатаграфічны «Навагрудчына ў аб’ектыве», якімі кіруюць былыя остарбайтары А. Р. Міхневіч і М. К. Касабукін, якія сумесна з работнікамі сацабароны індывідуальна з кожным праводзяць відэаінтэрв’ю. На працягу многіх дзесяцігоддзяў гэтыя людзі саромеліся расказваць падобныя факты са свайго жыцця, гэта было цёмнай плямай у іх біяграфіі, якая калечыць лёсы, перашкаджае жыць. Сёння іх споведзь вельмі актуальна для грамадства.

Вынікам рэалізацыі праекта стала новая экспазіцыя ў музеі, дзе былі прадстаўлены матэрыялы, сабраныя намаганнямі пажылых людзей (інфармацыйныя матэрыялы, дакументы, прадметы і рэчы побыту і інш.), кніга «Жизнь под знаком “OST”: сборник воспоминаний бывших остарбайтеров», дзе прадстаўлены ўспаміны жыхароў Навагрудчыны, якія ў час Другой сусветнай вайны былі вывезены на прымусовыя работы ў Германію, а таксама знаходзіліся ў канцэнтрацыйных лагерах [3]. Акрамя таго, у 2013 г. быў закладзены «Сад Справядлівасці і Міласэрнасці» на тэрыторыі Навагрудскага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя. Месца для сада было выбрана невыпадкова: у гады вайны там размяшчалася яўрэйскае гета. Праз некалькі гадоў на дрэвах з’явіліся невялікія шыльдачкі з імёнамі жыхароў Навагрудчыны, якія ў гады вайны ратавалі яўрэяў [7].

Адзначым, што музеі актыўна ўключаюцца ў праектную дзейнасць. У выніку падобных праектаў пашыраюцца межы музейнага дакументавання, з’яўляюцца новыя музейныя прад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

меты, развіваюцца формы культурна-адукцыйнай дзейнасці. Падобныя праекты дазваляюць прыцягнуць да музейнай дзейнасці людзей, якія традыцыйна выключаны са сферы музейнага ўплыву. У дадзеным выпадку – гэта прадстаўнікі так званага трэцяга пакалення. Акрамя таго праектная дзейнасць пашырае межы музея, які перастае быць толькі захавальнікам культуры, а паўстае перад намі новымі гранямі, становіцца культураўтвараючым інстытутам.

1. *Воронцова, Т.* Вклад в мировую культуру… [Электронны рэсурс] / Т. Воронцова // Слава працы (Капыль). – Рэжым доступу: http://www.kopyl.by/?p=4686. – Дата доступу: 02.05.2016.

2. *Дьячков, А. Н.* Актуализация культурного наследия / А. Н. Дьячков // Российская музейная энциклопедия: в 2 т. – М., 2001. – Т. 1. – С. 312.

3. Жизнь под знаком «OST» [Электронны рэсурс] // ДУК «Навагрудская раённая бібліятэка». – Рэжым доступу: http://novcrb.grodno.by/zhizn-pod-znakom-ost/. – Дата доступу: 02.05.2016 г.

4. *Лазоўская, Т.* Капыльскі краязнаўчы музей распачаў новы праект – «Выстаўкі з прыватных калекцый» [Электронны рэсурс] / Т. Лазоўская // Туризм и отдых. – Рэжым доступу: http://www.tio.by/novosti/19704. – Дата доступу: 02.05.2016 г.

5. *Марчук, Р.* Адчуць сябе патрэбным [Электронны рэсурс] / Р. Марчук // Вместе. – Рэжым доступу: http://www.wmeste.by/?p=5637. – Дата доступу: 02.05.2016 г.

6. Праекты [Электронны рэсурс] // УК «Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей». – Рэжым доступу: http://navagrudak.museum.by/node/34767. – Дата доступу: 02.05.2016 г.

7. Сад Справедливости и Милосердия // Навагрудскі раённы выканаўчы камітэт [Афіцыйны сайт]. – Рэжым доступу: http://novogrudok.grodno-region.by/ru/news/anoncy?id=11514. – Дата доступу: 02.05.2016 г.

8. *Шуракова, В. Л.* Опекуны счастья / ГУ «Копыльский районный краеведческий музей» ; Проект «TOLLAS – к активному обществу в любом возрасте» / В. Л. Шуракова. – Минск : Белсэнс, 2012. – 14 с.

9. *Шуракова, В. Л.* О проектах / В. Л. Шуракова // Бягучы архіў Капыльскага раённага краязнаўчага музея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ